ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
13
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 29 (1515)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## 14 лістапада

адбудзецца XXXII справаздачна-выбарная камсамольская канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. Нумар газеты прысвечаны гэтай падзеі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
ТЭЛЕТАЙП
• УЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА •

### Бюро парткома

разгледзела на чарговым пасяджэнні работу партбюро хімічнага факультэта па кіраўніцтву партгрупамі.

У. САТОЛІН.

### Сёння

адбудзецца чарговае пасяджэнне дыскусійнага інтэрнацыянальнага клуба «Палітыкус». Тэма — «Савецкі Саюз вачыма замежнага друку на сучасным этапе», дыскусія па якой адбылася ў мінулы раз, атрымае сёння працяг. Клуб збіраецца ў 206-й аўдыторыі ў 20 гадзін.

А. САМУЙЛІЧ.

### XXVII справаздачна-выбарная

прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў падвяла вынікі дзейнасці за мінулы перыяд. На ёй выступілі: са справаздачным дакладам старшыня прафкома супрацоўнікаў Г. В. Мацвееў; старшыня рэвізійнай камісіі І. Р. Гулакоў; дацэнт кафедры гісторыі КПСС, член таварыскага суда М. В. Прылепка; намеснік дырэктара НДІ ПФП А. А. Мінько; выкладчыца юрфака, старшыня прафбюро Г. Т. Мялешка; дацэнт філфака, старшыня прафбюро В. А. Навумовіч; дэкан фізічнага факультэта В. А. Гайсёнак; прафгрупорг аддзела СКТБ З. Я. Каська; старшы навуковы супрацоўнік, старшыня прафбюро НДІ А. В. Паўлаў; дацэнт кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, старшыня прафбюро Я. В. Петушкова; сакратар камітэта камсамола супрацоўнікаў С. Сяргееў; рэктар, акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.

Старшынёй прафкома супрацоўнікаў універсітэта выбраны дацэнт кафедры фізікі цвёрдага цела В. М. Анішчык, намеснікам — А. Ф. Нікіценка.

А. СЦЯПАНАЎ.

## Сардэчна вітаем дэлегатаў камсамольскай канферэнцыі універсітэта!

ФОТАЗАМАЛЕЎКА: ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА






# САКРАТАР

*КАЛІ Б СЯРГЕЮ ЛІТВІНЧЫКУ, сакратару камітэта камсамола гістфака прапанавалі намаляваць карціну пра тое, што больш за ўсё засталося ў памяці аб мінулым годзе, ён пачынаў бы яе так: будоўля, начное асвятленне... Гэта з тых дзён, калі працаваў будаўнічы атрад студэнтаў гістфака «Белая Русь» у Ленінабадзе. Тады давялося прыстасоўвацца да працы ў новых умовах: клімат не беларускі — спякота, духата. І ўсё ж яны працавалі. А ў выхадныя дні прымалі ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах культурна-спартыўнага комплексу мясцовага калгаса, сустракаліся з будатрадаўцамі іншых саюзных рэспублік, пелі камсамольскія песні.*

*Чым быў абумоўлены выбар месца дыслакацыі атрада? «...Гром, грукат, плач дзяцей. Я выбег з дому і зразумеў, што трэба нешта рабіць...» Можа гэтыя радкі з «Ленинобадской правды» дапамаглі добраахвотнікам-гістфакаўцам адшукаць на карце месца сваёй работы? Камандзірам атрада камуністычнай працы (а жаданне працаваць бязвыплатна ўзнікла ў іх адразу) выбралі Сяргея Літвінчыка, лідэра камсамольскай арганізацыі факультэта.*

(Працяг на 2-й стар.).

## А ШТО ЗА КРЫТЫКАЙ?

ДА ВЫНІКАЎ СПРАВАЗДАЧ І ВЫБАРАЎ

Не ведаю, як вы, а я часцей успрымаў камсамольскі сход як звычайную фармальнасць. Ды і большая частка маіх сяброў так лічыла.

РАНЕЙ. Таму што 31 кастрычніка адбылася у нас на фізічным факультэце справаздачна-выбарная канферэнцыя. Як яна звычайна праходзіць? Па пэўнаму плану: справаздача, выступленні ў спрэчках, выбары новага саставу камітэта камсамола. І часцей адсутнічала на ёй тое, што чакалі з году ў год камсамольцы факультэта — па-сапраўднаму дзелавая, адкрытая размова аб недахопах і дасягненнях, аб цяжкасцях і перадавым вопыце, аб праблемах і будучых справах. Можа таму і не адчувалася зацікаўленасці, ініцыятывы кожнага камсамольца?

Як і раней, выступаючыя гаварылі аб праблемах арганізацыі будаўнічых атрадаў, закраналі пытанні правядзення падпіскі на часопісы і газеты і арганізацыі палітдзён. Памятаецца, яшчэ ў мінулым годзе у такіх выступленнях больш успаміналі пра перамогі, афішыравалі поспехі і дасягненні. Цяпер камсамольцы навучыліся гаварыць пра недахопы ў сваёй рабоце адкрыта і сумленна.

Так, крытыкі на канферэнцыі хапала, але хацелася, каб прысутнічала і другое — канкрэтныя прапановы па выкараненню недахопаў. Іх не было. Не лічыце, што я папракаю камсамольцаў, проста ведаю: нам яшчэ шмат чаму трэба вучыцца.

Спадабалася тое, што размова па ўсіх аспектах камсамольскага жыцця факультэта была двухбаковай: у ёй прымалі ўдзел і самі камсамольцы, і выкладчыкі. Многа запісак (а гэта таксама ўпершыню) паступіла ў прэзідыум. У іх закраналіся па-сапраўднаму цікавыя і патрэбныя для аўдыторыі пытанні. І ні адна з запісак не засталася без пэўнай увагі. Лічу, варта падумаць пра дзейснасць такой формы зносін па падобных мерапрыемствах.

Адразу цяжка меркаваць пра тое, што дала нам канферэнцыя, але час павінен падвесці вынікі гэтай размовы, размовы патрэбнай і карыснай.

І. АКУШЭВІЧ,
студэнт фізічнага факультэта.

## ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА



# САКРАТАР

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

*Шмат памятнага засталося ў «Белай Русі» пасля працы ў Ленінабадзе. Адрасы новых сяброў, грамата Ленінабадскага райкома камсамола за першае месца ў сацыялістычным спаборніцтве, вочы дзяцей з Ісфарынскага дзіцячага дома, на ўпарадкаванне якога камсамольцы пералічылі 2 тысячы рублёў.*

*Гэта ў мінулым. А цяпер?*

*...Звініць званок на перапынак. У пакоі камітэта камсамола пачынаюць збірацца дзяўчаты і юнакі. Усё ажывае ў прасторным пакоі: грукоча пішучая машынка, складаюцца спісы, вядзецца размова... А дзверы не зачы-*

(Заканчэнне на 4-й стар.).



## ТРЫБУНА ПАРТОРГА

# БАЧЫЦЬ ПЕРСПЕКТЫВУ

**Узяты Камуністычнай партыяй стратэгічны курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны прад'яўляе да кожнага з савецкіх людзей новыя, высокія патрабаванні. На любым участку работы, у любой сферы дзейнасці ад кожнага з нас патрабуецца энергічна і актыўна, у вышэйшай ступені свядома выконваць свае абавязкі, практычнымі справамі ўвасабляць у жыццё рашэнні XXVII з'езда КПСС.**

КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ філалагічнага факультэта адна з буйнейшых ва універсітэце. Славіцца яна і многімі справамі. Пра некаторыя з іх шмат гаварылася на справаздачна-выбарнай канферэнцыі, але яшчэ больш было сказана пра недахопы, пра тыя бакі яе дзейнасці, што не задавальняюць як саміх камсамольцаў, так і іх старэйшых таварышаў — камуністаў. Асаблівая ўвага пры гэтым звярталася на развіццё ініцыятыўнасці, на пашырэнне правоў студэнтаў, камсамольскіх бюро ў рабоце ўсяго калектыву факультэта. Назначэнне стыпендыі, вылучэнне кандыдатур у аспірантуру, выдзяленне інтэрната, шырокі ўдзел у абмеркаванні работы кафедраў і асобных выкладчыкаў і многае-многае іншае — усё гэта яшчэ не стала справай рук саміх камсамольцаў, хоць не хваляваць іх усё гэта не можа. Таму партыйная арганізацыя і паставіла перад новым саставам камітэта камсамола задачу самага актыўнага ўдзелу камсамольцаў у факультэцкіх справах, надання камсамольскай арганізацыі тых правоў, пра якія было заяўлена з трыбуны XXVII з'езда КПСС. Камуністаў факультэта не можа не турбаваць пытанне самадысцыпліны і самакантролю студэнтаў за працэсам навучання, а калі шырэй — падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў з філалагічнай адукацыяй. Мы не адчулі неспакою камсамольцаў за зніжэнне якасці вучобы, за значны рост здавальняючых адзнак і як заканамернасць — за выпуск пасрэдных спецыялістаў.

Усіх нас не можа не хваляваць і пытанне павышэння культуры як у сэнсе паводзін у штодзённым жыцці, так і культуры работы, умення правільна і рацыянальна распараджацца вольным часам і г. д. Ва ўмовах нашага факультэта (і не толькі нашага) пытанні агульначалавечай культуры надзвычай моцна судакранаюцца з пытаннямі нацыянальнай беларускай культуры, найперш адносін да роднай мовы, літаратуры, да помнікаў гісторыі краю, вуснай народнай творчасці. Думаецца, што факультэцкая камсамольская арганізацыя, а зрэшты, і ўсяго універсітэта (усё ж Беларускага дзяржаўнага) магла б і тут быць наперадзе, паказваць узор беражлівага стаўлення да багатай і арыгінальнай спадчыны свайго народа.

Гаворачы пра работу камсамольскай арганізацыі факультэта, нельга не спыніцца і на такім пытанні, як павышэнне аўтарытэту выбарнага актыву, асабліва тых, хто самааддана працуе на грамадскай ніве і добра вучыцца. Так сталася, што пра горшых студэнтаў (і камсамольцаў) ведаюць больш, чым пра сумленных і працавітых. Пара ўсё паставіць на сваё месца. Мы слаба (або зусім) не ведаем сваіх стыпендыятаў, пра вопыт іх работы і вучобы. Калі ў маштабах факультэта гэта яшчэ лягчэй вырашаецца, то запытайцеся ў кіраўнікоў універсітэта, каго з ленінскіх стыпендыятаў яны ведаюць — і адказ будзе... А мы ж працуем са студэнтамі найперш! Я ўжо не гавару пра тое, што ў студэнцкіх аўдыторыях ніхто не можа прыпомніць, скажам, нашага міністра або яго намеснікаў, работнікаў рэктарата, камсамольскіх і партыйных органаў самага рознага ўзроўню. Пра многае яны б даведаліся ў саміх студэнтаў.

Гады вучобы ў БДУ праляцяць імгненна. І хочацца, каб кожны дзень быў паўнакроўны, насычаны новымі ведамі і новымі адкрыццямі. Каб у буднях, у паўсядзённай працы ўмацоўвалася ў кожнага вера ў сваю будучую прафесію, расла павага да вывучаемых дысцыплін. Каб кожны камсамолец ясна бачыў сваю перспектыву. Над гэтым працуюць камуністы, гэтыя пытанні на парадку дня кожнай камсамольскай арганізацыі.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
сакратар партыйнай арганізацыі філалагічнага факультэта.

## КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ СУПРАЦОЎНІКАЎ

**Якім чынам ідзе перабудова ў камсамольскай арганізацыі БДУ? Як мы рыхтуемся да XX з'езда камсамола? Гэтыя пытанні паставіў адзін з аўтараў анкет, якія мы атрымалі ў выніку невялікага сацыялагічнага даследавання.**

# ШТО МОКРАЕ ГАРЫЦЬ...

ЯКІЯ КАНКРЭТНЫЯ справы павінны дапамагчы перабудове работы нашага камітэта камсамола? Аб гэтым я і хачу павесці размову, бо праблемы, якія патрабуюць вырашэння, у нас былі, ёсць і будуць. І адкладваць іх нельга.

Напрыклад, непакоіць адсутнасць рэальнай сувязі камсамола з навукай і вытворчасцю, вельмі турбуе пасіўнасць камсамольцаў...

Пачну з галоўнага, з таго, што больш за ўсё хвалюе нас зараз. Справа ў тым, на жаль, што на практыцы звычайна адсутнічае сувязь камсамола з навукай і вытворчасцю. Прадбачу пярэчанні: маўляў, фізікі вось за апошні год здалі ў друк 70 навуковых артыкулаў, а хімікі—60. Аб гэтым многія ведаюць, але ж будзем да канца сумленнымі: да ўсяго гэтага камсамольская арганізацыя мае самае малое дачыненне. Тут, як было адзначана на камсамольскім сходзе фізічнага факультэта, заслуга больш навуковых кіраўнікоў, чым наша, камсамольскіх важакоў. Дарэчы, застаецца незразумелым: хваліць ці не хваліць фізікаў за іх 70 артыкулаў. Аб чым гаворыць гэтая лічба? З чым яе можна параўнаць? А можа, наадварот, 70 артыкулаў — гэта толькі кропля? Таму сам падыход — ацэньваць навуковую працу факультэта па надрукаваных артыкулах — здаецца не зусім правільным.

Амаль што на ўсіх справаздачна-выбарных сходах вялася гаворка аб атэстацыі ў межах Ленінскага заліку камсамольцаў-супрацоўнікаў. Дзе больш, дзе менш. Калі ж называць рэчы сваімі імёнамі, то ператварылася атэстацыя ў зафармалізаванае мерапрыемства. На мой погляд, не здольнае выконваць сваёй асноўнай задачы: павышэння грамадска-палітычнай актыўнасці камсамольцаў, далучэння іх да ўдзелу ў грамадскім жыцці. Чаго чакалі мы ад атэстацыі? Вядома, сур'ёзнай размовы аб становішчы спраў у камсамольскай арганізацыі. Адпаведную ацэнку павінны былі атрымаць і тыя, хто сапраўды працаваў, і тыя камсамольцы, што не выконвалі даручэнняў. Што атрымалася? Кожны прыйшоў на атэстацыю, маючы на паперы якое-небудзь даручэнне.

Нярэдка яшчэ адносяцца камсамольцы да атэстацыі, як да непрыемнага, але неабходнага рытуалу. Назіраеш за такой атэстацыяй і думаеш: здаецца, усе ж выдатныя хлопцы і дзяўчаты, у кожнага ёсць справа, а вось работы ўсёй камсамольскай арганізацыі няма ніякай магчымасці ўбачыць. Пэўна, трэба, з аднаго боку, павялічыць адказнасць кожнага камсамольца за даручаную яму справу і, з другога — адмовіцца ад старых форм работы.

Зараз многа гавораць аб фармалізме ў камсамоле. Гаворыць і аб тым, што трэба нешта змяніць. Але ж раптоўна ўсё перайначыць немагчыма. Трэба, каб зніклі тыя, хто не жадае выдаткаваць лішнюю гадзіну, прымаючы ўдзел у грамадскім жыцці. Так, фармалізм ёсць. Толькі хто ж яго навязвае? Бяру на сябе смеласць сцвярджаць, што ніхто. Часцей за ўсё гутаркі аб заарганізаванасці нараджаюцца неахвотай весці хоць якую-небудзь работу. Што ў нас здараецца часам? На сходзе прысутнічае палова камсамольцаў, жывое, зацікаўленае слова з'яўляецца рэдкасцю. Ці ж няма ў нас сапраўдных актывістаў? Ёсць. Толькі зараз нам патрэбна агульная актыўнасць камсамольцаў.

Аб ідэалагічнай і культмасавай рабоце, што вядзецца ў гэтым годзе, можна гаварыць шмат. Здавалася б, добрыя задумкі ў нас не пераводзяцца, а вось належнай увагі камсамольцаў усё яшчэ няма. Ці многіх зацікавіла ідэя аб стварэнні кінаклуба? Так, яна спадабалася, аб ёй доўгі час гаварылі. Толькі гутаркі так і засталіся гутаркамі. Між тым, існуюць у нас добрыя сувязі з кінапракатам, кінатэатрамі. Ёсць і неабыякавы да справы камсамолец-энтузіяст М. Далгіх. Чаму ж цікавая ідэя тоне ў безыніцыятыўнасці астатніх камсамольцаў?

Зараз, як ніколі раней, патрабуюцца нам не «галачка», не гучныя словы, а канкрэтныя справы.

**С. СЯРГЕЕЎ,**
сакратар камсамольскай арганізацыі супрацоўнікаў універсітэта.

## ВУЧОБА—ГАЛОЎНАЯ ПРАЦА СТУДЭНТА

# Дзейнічай, старшыня!

З Вікай Лашкінай, студэнткай IV курса факультэта прыкладной матэматыкі, я сустрэлася перад пачаткам лекцыі. Але дзяўчына трымала ў руках не канспект са складанымі формуламі і не падручнік. Гэта быў... томік вершаў Марыны Цвятаевай. На мой запытальны позірк Віка проста адказала:

— МАТЭМАТЫКА — даволі складаная навука, якая патрабуе стараннасці і лагічнага мыслення. Але яна не перашкаджае мне захапляцца мастацкай літаратурай. Вельмі люблю чытаць і таму выкарыстоўваю кожную вольную хвіліну.

Вось ужо два гады на ФПМ існуе савет выдатнікаў, і старшынёй яго з'яўляецца Віка Лашкіна. Чаму іменна яна? На «выдатна» Віка вучыцца яшчэ са школы. І тут, ва універсітэце, апраўдала Віка сваю ўзнагароду — залаты медаль. Трэці курс яна скончыла таксама на «выдатна».

На працягу года савет выпускае газету «Выдатнік», дасылае пісьмы і віншаванні са святам бацькам выдатнікаў. У канцы кожнага семестра савет выдатнікаў падводзіць вынікі сесіі: і тады ўжо не здабраваць тым, хто паленаваўся, атрымаў нездавальняючую адзнаку. На факультэце адбываюцца сустрэчы выдатнікаў са студэнтамі розных курсаў, дзе размова ідзе пра галоўнае — вучобу. В. Манцэвіч, Н. Падольская, В. Паўловіч з'яўляюцца гонарам факультэта ўжо не першы год.

Запомніліся апошнія словы Вікі: «Хацелася б, каб наш савет быў больш актыўны і дзейны». Ну што ж, гэта ў многім залежыць ад цябе, старшыня. Дзейнічай! Поспехаў табе!

**І. КАЖЭЎНІКАВА,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

# «ПАПЯРОВАЯ» АКТЫЎНАСЦЬ,
## або Як ператварыць яе ў справы

**Розныя меркаванні выказваліся за «круглым сталом» у рэдакцыі газеты. Размова ішла пра перабудову ў камсамольскім жыцці на факультэтах і ва ўсім універсітэце. Гаварылі пра недахопы і дасягненні, спрачаліся і часам не прымалі аргументаў таварышаў. Але ў адным сышліся ўсе — перабудова работы камітэтаў камсамола патрабуецца па многіх напрамках. І галоўнае тут — у ініцыятыве і жаданні кожнага.**

**КАР.: Мы часта говорым пра недапрацоўкі, недахопы ў рабоце камсамольскай арганізацыі, абвінавачваем ва ўсім членаў камітэта камсамола і нават не ўспамінаем пра тых, хто ціхенька праседжвае ў аўдыторыі і прывык больш карыстацца, чым аддаваць. Хто ж такія члены камітэта камсамола: людзі, што «вязуць» на сабе ўсю грамадскую работу факультэта ды яшчэ за гэта атрымліваюць вымовы і пакаранні?**

А. РУБЦОВА: Лічу, што ўсё залежыць ад таго, хто прыйшоў працаваць у камітэт. У ідэале гэта павінны быць людзі, якія перш-наперш апантаны сваёй справай, болей за другіх ведаюць, што патрэбна факультэту, а гэта значыць — кожнаму камсамольцу. Мне здаецца, у гэтым выпадку яны не будуць скардзіцца на жыццё і цяжкасці, бо змогуць весці за сабой усіх. А інакш, не маючы канкрэтнай праграмы дзеяння, яны будуць нагадваць аднаго з чэхаўскіх герояў, што кожны раз баяўся, «як бы чаго не выйшла» Ад чаго залежыць, якім будзе камітэт? Мяркую, ад таго, як пройдуць выбары.

І. КРЭТОВІЧ: У нас на факультэце ні для каго не сакрэт, чыя кандыдатура будзе вылучана на справаздачна-выбарным сходзе. Таму што спіс не толькі зацвярджаецца партыйным бюро і камітэтам камсамола, але і вывучаецца ў групах. Дзе, як не там, камсамольцы ведаюць адзін аднаго па сумеснай рабоце? Здаралася, і не раз, што кандыдатуры не знаходзілі падтрымкі ў групах, і тады мы аддавалі прыярытэт тым, каго рэкамендавалі групы. І не было выпадкаў, каб памыліліся.

Т. МЯДЗВЕДСКАЯ: Як было раней? Усе, каго прапанавалі, станавіліся членамі камітэта камсамола. На факультэцкай справаздачна-выбарнай канферэнцыі ў гэтым годзе кожнаму з кандыдатаў давалася характарыстыка, ставіліся пытанні. Пра недахопы ў рабоце таго ці іншага камсамольца мы гаварылі шчыра і адкрыта, не баючыся пакрыўдзіць ні дэканат, ні партыйнае бюро. Камсамольцы адказна аднесліся да выбараў, забыліся на былое меркаванне: «мая хата з краю...» Спрачаліся, не згаджаліся. У выніку ў новы састаў увайшлі па-сапраўднаму нефармальныя лідэры. Хочацца верыць, што ў іх усё добра атрымаецца.

**КАР.: Уявіце сябе на месцы тых, хто прыйшоў упершыню ў камітэт камсамола. Па сутнасці справы яны яшчэ нічога не ўмеюць, нічога не ведаюць...**

І. КРЭТОВІЧ: Каб такога не атрымалася, у нас на факультэце існуе традыцыя: прыблізна 60—70 працэнтаў новага саставу — ранейшыя «камітэтчыкі». Тыя, хто працуе ў камсамоле ўжо не год і не два. Таму камітэт не адаптуецца да новых умоў існавання месяц ці болей, а працягвае працаваць над тым, што пачынаў у мінулым годзе, без перапынку.

Т. МЯДЗВЕДСКАЯ: А мы лічым, што кожны мае права паспрабаваць свае сілы на кіруючай пасадзе. Кожны член камітэта камсамола на працягу года прыглядаецца да актыву свайго сектара і рыхтуе новую кандыдатуру да працы ў камітэце. Такім чынам, у нас існуе своеасаблівы перыяд стажорства. Калі ў камсамольца ёсць здольнасці і магчымасці, тады і працаваць ён будзе з большай зацікаўленасцю.




У гутарцы прымалі удзел:
Іна МАКАРАНКА — намеснік сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта па арганізацыйнай рабоце;
Таццяна МЯДЗВЕДСКАЯ — былы намеснік сакратара камітэта камсамола фізічнага факультэта па інтэрнацыянальнай рабоце;
Ірына КРЭТОВІЧ — былы сакратар камітэта камсамола філалагічнага факультэта;
Ала РУБЦОВА — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта журналістыкі па акадэмічнай рабоце;
Віктар ГУРЫН — рэдактар газеты «Імпульс» факультэта радыёфізікі і электронікі.

В. ГУРЫН: А я за камітэт, у якім большая частка саставу — студэнты малодшых курсаў. У нас, напрыклад, атрымалася так, што ў мінулым годзе былі задзейнічаны пяцікурснікі. Яны, як гаворыцца, проста цягнулі час. Мяркуйце самі: для іх гэтая справа была нечым накшталт недарэчнай нагрузкі — абы спіхнуць са сваіх плячэй. Патрэбны людзі, якія б паспелі яшчэ за час сваёй вучобы ўбачыць, як пачатыя імі справы адгукнуцца ў будучым. Гэта няпраўда, што першакурснікі не здолеюць, я ведаю нямала прыкладаў, якія даказваюць адваротнае.

**КАР.: І ўсё ж дазволь з табой, Віктар, не згадзіцца. Нельга адмаўляць ролю і значэнне вопыту і майстэрства.**

Т. МЯДЗВЕДСКАЯ: Зразумела, на адных тэарэтычных ведах і вопыце работы ў школьным камсамоле арганізаваць адразу ўсе справы немагчыма. На дапамогу павінна прыходзіць школа камсамольскага актыву універсітэта. Праўда, амаль усюды існуе яна фармальна. Зрэшты, знаходзяцца факультэты, на якіх пра яе ўспамінаюць не толькі на паперы. Але чамусьці неахвотна займаюцца там камсамольскія актывісты. Канкрэтнай размовы, сустрэч, дыскусій тут не адбываецца. Таму і не прыходзяць на нудныя, нікому не патрэбныя пасяджэнні. Асноўная мэта якіх — новыя даручэнні і папяровыя справаздачы аб выкананых справах. Камсамольцы ж чакаюць і жадаюць атрымаць сапраўдныя парады, выказаць свае думкі.

В. ГУРЫН: Відавочна, што трэба выхоўваць камсамольскіх актывістаў на сапраўднай справе, канкрэтнымі прыкладамі ўжо з першых дзён іх знаходжання на факультэце. Спачатку, вядома, нельга патрабаваць ад першакурснікаў арганізацыі якіх-небудзь спраў — яны павінны мець уяўленне аб тым, як трэба рыхтавацца і што павінна атрымацца. На маю думку, паказальным прыкладам такой работы з'яўляюцца сустрэчы старшакурснікаў з першакурснікамі. Яны адбываюцца на нашым факультэце ў самым пачатку года ў аўдыторыі, дзе займаюцца першакурснікі, і нагадваюць невялікі канцэрт з лепшых нумароў, падрыхтаваных да дзён радыёфізікаў.

**КАР.: Вынікі работы камітэта камсамола часцей за ўсё залежаць ад таго, існуе ці не кантакт з кожнай групай, з кожным камсамольцам...**

І. КРЭТОВІЧ: Так. Я згодна з гэтым. Не павінна быць ніякага дзялення на «эліту» — камітэт камсамола і астатніх, тых, што вучацца ў камсамольскіх групах. Не ведаючы жыцця груп, нельга не толькі весці работу, але і планаваць сваю дзейнасць. І тут не патрэбны доўгатэрміновыя афіцыйныя індывідуальныя гутаркі і вывучэнне характарыстык, якімі так любяць пахваліцца некаторыя камсамольскія работнікі. Дастаткова, каб дзверы ў пакой камітэта камсамола былі заўсёды расчынены. Часам такія кароткія гутаркі многае даюць для ўяўлення таго, што адбываецца ў калектывах «пярвічак».

Т. МЯДЗВЕДСКАЯ: Падзялюся сваімі назіраннямі. Як у апошні час даходзяць да нас звесткі з камітэта камсамола універсітэта? Складаны і цяжкі ў іх шлях. Спачатку збіраюцца сакратары факультэцкіх камітэтаў камсамола, якія даводзяць да адказных за сектары, калі і дзе адбудуцца пасяджэнні і г. д. А пакуль такім чынам інфармацыя дойдзе да груп, згадзіцеся, звесткі паспеюць ператварыцца ў чуткі. Якая ж можа весціся размова пра падыход да кожнага?

В. ГУРЫН: А нярэдка здараецца і такое, як было ў нас. На маім курсе палова камсамольцаў не ведала амаль што цэлы год прозвішча сакратара камітэта камсамола. Аб непасрэднай сувязі: «камітэт — група» і гаворкі не вялося. Зрэдку прысутнічалі на камсамольскіх сходах і грамадска-палітычнай атэстацыі члены камітэта камсамола. Часцей за ўсё прыходзілася звяртацца з пытаннямі да камсорга, які і сам не заўсёды ўсё ведаў.

**КАР.: Ужо не ў першы раз заўважаю, як дзейнічае ў камсамольскай рабоце закон «вялікіх лічбаў». Мы рапартуем аб тым, колькі суботнікаў і вечароў адбылося, падлічваем колькасць удзельнікаў і толькі зрэдку заўважаем інтарэсы канкрэтных людзей, канкрэтных камсамольцаў.**

А. РУБЦОВА: Нельга наогул адмаўляцца ад масавасці. Бо сама па сабе гэта справа нядрэнная, калі ў патрэбным, цікавым мерапрыемстве прымаюць удзел многія людзі. Але ж, на жаль, у пагоні за лічбамі аб самой справе і яе мэтах часцей за ўсё не памятаюць.

І. МАКАРАНКА: Жадаеце прыклад? Не далей як у сярэдзіне мінулага года арганізоўваўся дзень адпачынку ў Шчамыслiцы. Павінна было, каб у паходзе ўдзельнічала 15 чалавек ад кожнай групы. Мы вырашылі пайсці ўсе разам. І што атрымалася? Прыйшлі ўдзельнікі, а арганізатараў так і не было. Вось вам і адказнасць за справу.

І. КРЭТОВІЧ: Незразумела, навошта існуюць такія мерапрыемствы, калі не тлумачаць, дзеля чаго яны патрэбны, а толькі патрабуюць: лічбы, лічбы... Можна было б маўчаць, калі б такія выпадкі не сустракаліся на кожным кроку. Трэба не прымушаць, а тлумачыць мэту той ці іншай справы. Студэнт зможа адрозніць тое, што патрэбна, ад безаблічнага масавага мерапрыемства дзеля «галачкі». Перш чым даводзіць нешта да факультэтаў, члены камітэта камсамола павінны абмеркаваць мэтазгоднасць тых ці іншых загадаў і прапаноў.

Якраз прыгадала, як вясной мінулага года прыйшлося распаўсюджваць білеты на масавы прагляд кінафільма. Не ведаю, як вам, а мне гэта не ўдалося. І тады, узяўшы білеты, якія засталіся, я пайшла ў кінатэатр у надзеі, што змагу іх прадаць. Як жа здзівілася, калі ўбачыла другіх «білетагандляроў» таксама з нашага універсітэта.

Т. МЯДЗВЕДСКАЯ: Часам ад нас патрабуюць «зверху» якасці выкананай справы, не здагадваючыся пра тое, што займаюцца ёю людзі выпадковыя. Так здараецца. І нярэдка. Таму што інфармацыя пра тое ці іншае мерапрыемства прыходзіць у групу ў самы апошні момант.

І. МАКАРАНКА: Вось, напрыклад, сёння. У 12 гадзін аб'явілі нам, што наша група павінна працаваць на суботніку па рамонту «Гаўдэамуса». Як жа да яго падрыхтавацца, узяць неабходныя рэчы, калі заняткі заканчваюцца толькі ў 14 гадзін?

В. ГУРЫН: Мабыць, уся справа ў тым, што адсутнічае канкрэтнае планіраванне работы камітэтаў камсамола факультэтаў. Мне могуць запярэчыць і паказаць горы папер і даведак. Пра іх існаванне я, зразумела, ведаю. Але ведаю і другое: план складаецца і накіроўваецца «наверх», а потым доўгі час пакрываецца пылам.

А. РУБЦОВА: Здараецца, што на паперу затрачваецца шмат сіл і часу, ёй надаецца столькі ўвагі, што на астатняе (па сутнасці справы, самае галоўнае) ні таго, ні другога не хапае.

І. КРЭТОВІЧ: Мяне раней здзіўляла, адкуль бярэцца фармалізм? Але потым зразумела: не столькі «зверху», колькі ў саміх камсамольскіх групах. Заўважалі, як у большасці выпадкаў праходзіць у нас камсамольская атэстацыя? Займаюцца на ёй тым, што спрабуюць як мага красамоўней расказаць камісіі пра ўсё добрае, і закрываюць вочы на недахопы. Каго спрабуюць ашукаць камсамольцы? Не ведаю, а ашукваюць у першую чаргу саміх сябе, бо ад вялікай колькасці добрых і выдатных адзнак жыццё групы не стане цікавейшым.

Была я не так даўно на справаздачным сходзе II курса беларускага аддзялення нашага факультэта. Склалася ўражанне, што нікому не было ніякай справы да існуючых праблем з вучобай і грамадскай актыўнасцю камсамольцаў. Ды і сходам усё, што адбывалася, цяжка было назваць — так, сабраліся людзі толькі таму, што трэба. Каму? А кожны павінен зразумець гэта адразу і самастойна. Адказ жа зусім просты: групе.

**КАР.: Мы закранулі ў размове шмат пытанняў камсамольскага жыцця ва універсітэце. І ўсё ж якія бачыце вы асноўныя напрамкі дзейнасці камсамола?**

А. РУБЦОВА: Я разумею перабудову камсамольскай работы ва універсітэце перш за ўсё праз пераадоленне інерцыі, адмаўленне ад «пацёмкінскіх вёсак» і бутафорскіх стэрэатыпаў, засяроджанне ўвагі камсамольцаў на ключавых напрамках, самых балючых пытаннях студэнцкага жыцця.

**Збіраючыся за «круглым сталом», мы разлічвалі пачуць меркаванні прадстаўнікоў усіх факультэтаў. Але чамусьці не ўсіх хвалююць праблемы арганізацыі камсамольскага жыцця. Мала верыцца ў тое, што на астатніх шасці факультэтах не існуе закранутых намі праблем перабудовы камсамольскай работы. Чым жа тады, як не інертнасцю, нежаданнем што-небудзь змяняць, тлумачыцца гэтая красамоўная адсутнасць?**

**Зразумела, ахапіць і вырашыць усе праблемы ў адным газетным матэрыяле няма ніякай магчымасці. Таму гутарка на старонках газеты будзе працягвацца. Запрашаем прыняць у ёй удзел усіх зацікаўленых.**

Вяла і запісала гутарку
М. ЗАГОРСКАЯ.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

ВЫЗНАЧЫМ ККД

**Вось і завяршыўся другі этап Усесаюзнай ваенна-патрыятычнай аперацыі «Рэвалюцыйны трымаем крок!». Надышоў час падвядзення вынікаў, час новых планаў на трэці, заключны этап аперацыі.**

# ЯКАСЦЬ,
## І ЯШЧЭ РАЗ ЯКАСЦЬ!

НЕЛЬГА не адзначыць, што работа па патрыятычнаму выхаванню камсамольцаў на хімічным факультэце была насычана разнастайнымі мерапрыемствамі. Расказваць аб усіх іх, лічу, няма ніякага сэнсу. Ды не аб гэтым жадаю весці гаворку: непакоіць мяне якасць.

Мы шмат гаворым пра перабудову ў нашым жыцці. Не павінна заставацца ўбаку ад усяго новага і работа камітэта камсамола. Што ж атрымліваецца ў нас?

Згадзіцеся, гаворачы аб грамадскай рабоце, нельга вылічваць каэфіцыент карыснага дзеяння. І тым не менш я паспрабаваў. І зразумеў, ацэньваючы некаторыя справы, на якія выдаткавана нямала сіл і сродкаў, што іх ККД роўны амаль што нулю. Ведаю па гутарках з адказнымі за ваенна-патрыятычную работу на другіх факультэтах: як і на маім, там такое здараецца нярэдка, і там таксама існуюць падобныя праблемы. Як жа павялічыць карыснасць нашай работы?

Ні для каго ўжо доўгі час не з'яўляецца сакрэтам, што поспех ваенна-патрыятычнай (як, дарэчы, і ўсёй ідэалагічнай) работы залежыць ад двух фактараў: вопыту арганізатараў і актыўнасці камсамольцаў. Пра тое, што абавязкова павінна існаваць актыўнасць арганізатараў, я ўжо і не кажу. Хаця сустракаюцца выпадкі, калі яна адсутнічае. Акцэнтаваць увагу на тым, як набываюцца тэарэтычныя веды і вопыт, таксама не буду. Ужо таму, што для падрыхтоўкі сапраўдных арганізатараў існуе факультэт грамадскіх прафесій, дзе, на мой погляд, і выкладчыкі кваліфікаваныя, і лекцыі цікавыя. А вось як наконт актыўнасці?

Многія камсамольцы, эрудзіраваныя ў шматлікіх пытаннях, да ўдзелу ў разнастайных мерапрыемствах дэманструюць такую інертнасць і незацікаўленасць, што проста здзіўляешся. Як іх прывабіць? У адказных за ваенна-патрыятычную работу тут шырокае поле дзейнасці. Трэба толькі памятаць пра тое, што работа па патрыятычнаму выхаванню ні ў якім выпадку не павінна насіць займальна-пацяшальны характар. Гэта адна з асаблівасцей і адна з прычын, на якія нярэдка спасылаюцца, жадаючы апраўдацца: маўляў, паспрабуйце самі адшукаць цікавую форму для правядзення сур'ёзнага мерапрыемства. Між тым, шукаць трэба, бо патрыятычнае выхаванне — гэта абавязковая частка работы па станаўленню чалавека, грамадзяніна СССР.

Якасць знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад колькасці. Таму зараз я прапаную: давайце не будзем праводзіць шмат мерапрыемстваў, а тым больш ганяцца за вялікімі і незразумелымі лічбамі. А тое, што арганізуем, паспрабуем зрабіць такім, каб камсамольцы не лічылі прысутнасць і ўдзел толькі непатрэбнай, надакучлівай павіннасцю.

А. БУМБЛІС,
студэнт хімічнага факультэта.

ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА

# САКРАТАР

(Заканчэнне. Пачатак на 1—2-й стар.).

*няюцца. Прыходзяць новыя людзі. Большасць з іх застаецца. Я пацікавілася ў Сяргея: што прыводзіць амаль кожны перапынак сюды адных і тых жа людзей?*

*— Прыходзяць тыя, каго некалькі дзён назад выбралі ў састаў новага камітэта камсамола. Але больш за ўсё — былыя «камітэтчыкі». Непакояцца за работу навічкоў. Прыходзяць дапамагаць, тлумачыць.*

*Пра многае гавораць гэтыя наведванні. Пра тое, што існуе незанатаваны закон дапамогі. І пра тое, што за мінулы год склаўся сапраўдны калектыў у камітэце камсамола гістфака. І пра арганізацыйныя здольнасці і чалавечыя якасці яго сакратара таксама.*

*— Як прайшоў справаздачна-выбарны сход?*

*— Адно магу сказаць з упэўненасцю: пасіўных, якія прысутнічалі фармальна, на ім не было. І гэта добра. Столькі прапаноў, пажаданняў...*

*У нас вельмі складаная структура камсамольскай арганізацыі: групавыя, курсавыя. Камсамольскія арганізацыі аддзяленняў — яшчэ адно звяно пры выхадзе «пярвічнай» на факультэцкі камітэт камсамола. Паспрабуем значна спрасціць. Паўстае і пытанне пра камсамольскую самаатэстацыю. Мне здаецца, яна камсамольцам патрэбна больш, чым атэстацыя, якая існуе цяпер,— дзеліцца Сяргей новымі клопатамі.*





*В. КАРАЛЕНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА

# Пра вуліцу Студэнцкую

**Ключы ад кватэр уручалі без асаблівых цырымоній. І не таму, што не радаваліся новым жыхарам, хутчэй наадварот: рабочыя рукі ў вёсцы ніколі не лішнія. Проста час гарачы — лета, не да ўрачыстасцей. І ўсё ж без радасці, усмешак і ўдзячнасці не абышлося. Прыгожыя, утульныя дамы атрымалі людзі, якія эвакуіраваліся з Нараўлянскага раёна ў саўгас «Бабоўскі», што на Жлобіншчыне. Прыемна было чуць словы ўдзячнасці студэнтам факультэта радыёфізікі і электронікі, якія прыехалі на будоўлю ў саставе атрада імя Пятра Купрыянава.**

КАЛІ АТРАД яшчэ толькі фарміраваўся, яго байцы вырашылі працаваць у Карэліі. Амаль усе дакументы былі афармлены, а тут даведаліся, што неабходна змяніць месца дыслакацыі. Арганізацыйныя пытанні вырашалі хутка. Не было ні разгубленасці, ні незадаволенасці: трэба, дык трэба, ды і ў Карэліі не адпачываць збіраліся.

З першых дзён студэнты паказалі, на што яны здатныя. «Кельмай валодаюць, як сапраўдныя будаўнікі!» — не раз гаварылі пра іх, ацэньваючы працу адзнакай «выдатна».

— Працавалі з поўнай аддачай сіл усе без выключэння,— гаворыць камандзір атрада Барыс Грубноў,— і галоўнае — якасна.

З душой працавалі ўсе. Але ж і зараз сцвярджаюць хлопцы, што без вопытных у будаўнічай справе чацвёртакурснікаў Аляксандра Апалькі, Аляксандра Белаглазава, камісара Уладзіміра Шалатоніна атраду прыйшлося б цяжка.

З адпачынкам не ўсё ладзілася. Пасля насычанага справамі працоўнага дня забываліся і пра студэнцкі касцёр, і пра гітару. Але ўсё ж байцы атрада знаходзілі час і на ўдзел у фестывалі будаўнічых атрадаў, і на падрыхтоўку выступлення агітбрыгады.

Тры з паловай тысячы рублёў студэнты пераявілі у фонд пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

В. КАЗЛОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ПРАМАЯ СУВЯЗЬ

**На многіх факультэтах адбыліся ў час грамадска-палітычнай атэстацыі гутаркі, разгарнуліся нават пэўныя дыскусіі наконт формы асабістых комплексных планаў. Меркаванні былі розныя, але з аднолькавай інтанацыяй: не задавальняе камсамольцаў існуючая форма, лічаць яе часцей за ўсё занадта бюракратычнай і ўвогуле непатрэбнай...**

**На гэтае і іншыя пытанні камсамольцаў адказвае намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па арганізацыйнай рабоце Аляксандр ГУТАВЕЦ:**

# ЗАДАЎ ПЫТАННЕ КАМСАМОЛЕЦ

— Гэта добра, што студэнты крытычна падыходзяць да асабістых комплексных планаў. Але вось што адбываецца: незадаволенасць незадаволенасцю застаецца, творчага выхаду на нас, камітэт камсамола, няма. Крытыкуюць у сябе на факультэтах. А хто з камсамольцаў хоць раз прыйшоў да нас з канкрэтнай прапановай? Другую форму АКП, якую мы маем, распрацаваў і прапанаваў камітэт. Колькі спрэчак было, выказванняў, дапрацовак! Чаму ж самі камсамольцы не прымалі ўдзел у папярэднім абмеркаванні? Відаць, і зараз чакаюць, калі нехта за іх прыдумае новую форму, якую можна крытыкаваць пасля яе зацвярджэння?

— І яшчэ адно пытанне: наконт практычнага выкарыстання набытых ва універсітэце ведаў, але ўжо ў час вучобы. Чаму толькі на некаторых факультэтах існуюць спецыялізаваныя навуковыя атрады?

— Спецыялізаваныя навуковыя атрады — гэта наш перспектыўны напрамак. Ужо дзейнічаюць два атрады на фізфаку, адзін фарміруецца на гістарычным факультэце. Лічу, што калі на пэўным факультэце ўзнікне неабходнасць стварыць спецыялізаваны атрад, мы супраць мець нічога не будзем. А толькі падтрымаем і дапаможам. Згадзіцеся, што фарміраваць такі атрад — справа факультэцкага камсамола, а не камітэта камсамола БДУ. Калі ён сапраўды патрэбны, дзейнічайце самі, не чакаючы, пакуль дапаможа нейкі лагодны дзядзька.

**— А вось скарга ад радавых камсамольцаў. Чаму часта аб тым, што плануе камітэт камсамола, мы даведваемся, як гаворыцца, праз дзесятыя вусны?**

— Усю інфармацыю аб рашэннях камітэта камсамола БДУ, планах работы атрымліваюць камсамольскія актывісты факультэтаў. Іх задача — давесці гэтую інфармацыю да груп, да кожнага камсамольца. Мы даём ім установкі своечасова. Ад таго, што не ўмеюць у нас працаваць з інфармацыяй, што лічаць неабавязковым даводзіць яе да ўсіх, і ўзнікаюць такія пытанні. А я, напрыклад, упэўнены, што гэта не так складана зрабіць. Справа ў тым, што спачатку патрэбна жаданне і не толькі актыву, але і членаў камсамольскай групы.

**— Апошняе пытанне гучыць як катэгарычнае: ці не вельмі мы «забюракратызаваліся»?**

— Лічу, што папер у нас не так шмат. Калі чалавек працуе, то яму не цяжка напісаць справаздачу раз у месяц, коратка, па прапануемых пунктах. Мы імкнёмся скараціць аб'ём папер да мінімуму: тое, што неабходна для кантролю, для таго, каб мець уяўленне аб становішчы на месцах.

Запісала С. ГОГАЛЬ,
наш кар.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
13 лістапада 1986 г.
АТ 07639. Зак. 1378.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.